# Што такое адзінства

Краеў Аляксандр Яўгенавіч
Установа адукацыі
”Мазырскі дзяржаўны абласны ліцэй”
10 клас

У апошні час усё часцей чуюцца размовы пра адзінства народа. Сапраўды, пытанне на сённяшні дзень носіць актуальны характар.І гэта звязана з тым, што робіцца ў свеце. А ў свеце ідзе барацьба за перадзел ужо падзеленага свету, за ўладу. Гісторыя паўтараецца. Але з кожным разам гэты працэс уздымаецца на новую ступень у сваім развіцці, набывае новыя рысы.

Як ніколі, сёння важна ведаць, хто ты ёсць: тваё месца нараджэння, твая нацыянальнасць, прыналежнасць да пэўнага народа. Калі ў цябе ёсць адказ на гэтыя пытанні, то ты шчаслівы чалавек.

Я па нацыянальнасці – Беларус! Я жыву ў незалежнай краіне Беларусь! Лёс майго народа быў складаны і цяжкі ва ўсе часы. Але нашы людзі заўсёды з годнасцю пераносілі ўсе цяжкасці.І я ганаруся гэтым, бо беларусы слывуць у свеце як людзі з чыстаю душою і светлым сумленнем, як добры, шчыры, цярплівы, мудры, памяркоўны народ. У мяне ёсць вялікая Радзіма – гэта цудоўны край блакітных азёр, зялёных лясоў, і ёсць малая Радзіма, Радзіма-маці, Бацькаўшчына. Добра растлумачаны гэтыя словы-сінонімы ў словах К.Ушынскага:” Бацькаўшчынай мы завем нашу краіну таму, што ў ёй жылі нашы бацькі і дзяды нашы.Радзімай мы завем яе таму, што ў ёй нарадзіліся, у ёй гавораць на роднай нам мове, і ўсё ў ёй для нас роднае. Маці – таму , што ўскарміла нас сваім хлебам, успаіла сваімі водамі, навучыла сваёй мове, як маці, яна абараняе і беражэ нас ад усякіх ворагаў”.

Беларусь сёння – гэта дзіўная краіна, якая аб’ядноўвае рысы самабытнай культуры, старажытных традыцый і сучаснасці. Гэта краіна, якая не перастае здзіўляць нават самых заядлых падарожнікаў. Калі вы ўбачыце ўсю прыгажосць нашай прыроды, паслухаеце мелодыку беларускай мовы(яна займае другое месца ў свеце па мілагучнасці), то адчуеце бязмежную гасціннасць міралюбівых беларусаў. У карагодзе весялосці і радасці закружаць вас беларускія традыцыі і святы. А калі наведаеце Беларусь, то не застанецеся без нацыянальных сувеніраў – тканых ручнікоў, вырабаў з гліны, саломкі ці лёну. Традыцыйныя беларускія стравы таксама не пакінуць вас абыякавымі. Дранікі і бабкі, бульбяныя клёцкі, стравы з мяса, малака, гародніны, рыбы і грыбоў запомняцца надоўга.

Мы – талерантная нацыя, якая шчыра прымае сяброў. Мы – адзіны народ са сваімі патрыятычнымі каштоўнасцямі, з мэтай абароны сваёй Радзімы, а таксама інтарэсаў, традыцый, звычаяў свайго народа.

Адзінства – гэта адна з асноўных каштоўнасцяў, якія сёння ёсць у беларускага народа.

Для мяне народнае адзінства – гэта цёплыя ўзаемаадносіны, гэта таварыскасць,чалавечнасць, якія павінны аб’ядноўваць людзей.Гэта любоў да бацькоў, да сваёй Радзімы, да захавання яе каштоўнасцяў. Гэта павага да

гістарычнага мінулага, да захавання гістарычнай памяці аб Вялікай Айчыннай вайне, Перамозе. Адзінства – гэта , калі маладое пакаленне з годнасцю прымае ўдзел у "Несмяротным палку", дзе кожны адчувае гордасць і веліч за сваіх продкаў, адчувае падтрымку адзін аднаго.

Мы, беларусы, згоднасцю можам заявіць, што мы – адзіны народ! У нас нават зацверджана новае дзяржаўнае свята – Дзень народнага адзінства. Яно адзначаецца 17 верасня. Гэта падзея звязана з аб'яднаннем Заходняй і Усходняй Беларусі. На працягу васямнаццаці гадоў, згодна Рыжскаму мірнаму дагавору, амаль чатыры мільёны чалавек, якія жылі ў Заходняй Беларусі, былі пазбаўлены права гаварыць і вучыцца на роднай мове, развіваць сваю культуру і проста звацца беларусамі.І толькі ў 1939 годзе, калі Германія напала на Польшчу, Чырвоная Армія перайшла савецка-польскую мяжу і ўзяла пад абарону насельніцтва Заходняй Беларусі.Людзі сустракалі вызваліцеляў кветкамі, аказвалі ім дапамогу.

Здарова, таварышы! Доўга чакалі
Мы вас і чакала ўся наша зямля.
Не раз мы выходзілі ў сінія далі,
Не раз углядаліся ў сонечны шлях!

Такім вершам у свой час вядомы беларускі пісьменнік Максім Танк сустрэў вызваленне Заходняй Беларусі, бо падзея была такой велічнай для ўсяго беларускага народа, што трэба было неадкладна на яе адгукнуцца.

Такім чынам, 17 верасня стала для беларусаў святам яднання і свабоды.Народ Беларусі стаў жыць адной сям'ёй, будаваць агульны дом.Вось гэта і ёсць адзінства!

Хачу завяршыць сваё сачыненне пажаданнем на будучае. Мая будучыня – гэта будучыня маёй Радзімы – Беларусі. Я жадаю ёй заставацца такой жа чыстай, зялёнай і спакойнай, я жадаю ёй мірнага неба над галавой, бо гэта , на маю думку, галоўная ўмова для шчаслівага жыцця народа.А мы-беларусы-па праву заслужылі быць шчаслівымі!